# ПАНЯЦЦЕ СУДОВАЙ УЛАДЫ Ў КАНТЭКСЦЕ ПРАБЛЕМЫ РАЗУМЕННЯ ФЕНОМЕНУ ЎЛАДЫ

*Т.У.Іванова, БДУ*

Мы не можам цалкам спазнаць з'яву ўлады, але мы можам сфармуляваць некаторыя ўяуленні пра яе. Нас феномен улады цікавіць у кантэксце пошуку правільнага разумення дзяржаўнай улады і яе віду -судовай улады.

Усялякая сацыяльная з'ява ўбірае ў сябе грамадскае і ў той жа час індывідуальнае, паколькі яна стварэнне не толькі грамадства ў цэлым, але і асобных індывідаў, і праходзіць праз іх свядомасць [2]. Улада -гэта першым чынам прыроджаная біяпсіхічная здольнасць чалавека аказваць уздзеянне на іншых з мэтай правядзення сваёй волі, свайго інтарэсу, які прыроджана дамінуе ў чалавеку.

Грамадства, усведамляючы запатрабаванне ўпарадкавання шматлікіх сфер свайго жыцця, а таксама магчымасць такога ўпарадкавання толькі з дапамогай надзеленых здольнасцю ўладарыць асоб альбо групы асоб, вылучае іх і ўзводзіць іх здольнасць у ранг паўнамоцтваў, дакументальна і іституцыянальна афармляючы гэту здольнасць у дзяржаўную ўладу. Дзяржаўная ўлада – спараджэнне сацыяльнай улады –паўстае як сістэма вызначаных паўнамоцтваў, якія ажыццяўляюцца вызначанай сістэмай органаў дзяржавы, што ўключае асоб, надзеленых біяпсіхічнай здольнасцю ўладарыць[3, с.20]. Дзяржаўная ўлада - сістэма паўнамоцтваў, даручаных сістэме дзяржаўных органаў, але гэта не сама сістэма органаў.

Прырода судовай улады вынікае з прыроды ўлады. Гэта від дзяржаўнай улады. Адпаведна, судовая ўлада ўяўляе сабою сістэму паўнамоцтваў, якія ажыццяўляюцца сістэмай судовых органаў. Пры гэтым дзеля існавання самастойнага віду судовай улады важна супадзенне сістэмы адпаведных паўнамоцтваў з сістэмай адпаведных органаў -судовых органаў, рэалізацыя гэтымі органамі як носьбітамі менавіта судовай улады сваёй асноўнай функцыі –функцыі ажыццяўлення правасуддзя. Судовая ўлада не зводзіцца да сістэмы судовых органаў. Паняцце *судовыя органы* сінанімічна паняццю *органы судовай улады*. Паколькі па-за судовымі органамі адсутнічае самастойны від судовай улады. Гэта толькі асобныя юрысдыкцыйныя паўнамоцтвы. Суд –адзінка сістэмы судовых органаў [4, с.81]. У рамках сваёй асноўнай функцыі судовыя органы маюць права ажыццяўляць розныя віды паўнамоцтваў, якія уваходзяць у сістэму паўнамоцтваў менавіта судовай улады: праватворчасць пры адпраўленні правасуддзя. Дадзеныя паўнамоцтвы судовых органаў не парушаюць балансу паміж відамі дзяржаўнай улады.

Такое разуменне судовай улады дазваляе вылучыць яе сярод іншых відаў дзяржаўнай улады як самастойную, а таксама дапускае розныя віды паўнамоцтваў (напрыклад, праватворчыя) у рамках адзінай сістэмы судовых паўнамоцтваў і асноўнай юрысдыкцыйнай функцыі судовых органаў, дазваляе вызначыць шляхі удасканалення судовай улады, сістэмы судовых органаў.

З'ява ўлады ў цэлым і яе шматлікіх відаў, у тым ліку і дзяржаўнай улады і яе відаў -гэта інтаграцыйнае паняцце, якое патрабуе пастаяннага вывучэння і дапаўнення, паколькі яно змяняецца нароўні са зменай сацыяльнай рэальнасці. Нельга прэтэндаваць на абсалютнае спазнанне феномену ўлады, але можна наблізіцца да яго правільнага разумення на дадзеным этапе развіцця грамадства.

Мы прапанавалі свой пункт погляду. Тым не менш, пытанне аб прыродзе ўлады, дзяржаўнай улады, судовай улады ў прыватнасці, застаецца адкрытым.

Літаратура:


1. Халіпаў У.Ф. Уводзіны ў навуку аб уладзе/У.Ф.Халіпаў.-М., 1996.-380 с.
2. Безнюк Д.К. Улада: Метадалагічныя асновы сацыялагічнага аналізу/Д.К.Безнюк.-Мінск: Бел.навука, 1998.-128 с.
3. Дубавіцкі У.М. Выканаўчая ўлада ў Рэспубліцы Беларусь: паняцце і сістэма органаў/У.М.Дубавіцкі.-Мінск: Беларуская навука, 2006.-175 с.
4. Судовая ўлада/Т.Е.Абава [і інш.]; пад рэд. І.Л.Петрухіна.-М.: ТАА "ТК Велбі", 2003.-720 с.